Са святам, дарагія жанчыны !!!

ГАЗЕТА ГОМЕЛЬСКАГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ ФРАНЦЫСКА СКАРЫНЫ

# Гомельскі універсітэт



№ 4(905) | Серада, 6 САКАВІКА 1996 г. | Газета заснавана ў верасні 1969 года | Выходзіць два разы ў месяц | Цана дагаворная

## РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛОНКА

Даўно адышоў у гісторыю 1910 год. Менавіта з ім звязана ўзнікненне свята жанчын. Яно было ўстаноўлена на 2-й Міжнароднай канферэнцыі сацыялістак, якія працавалі і змагаліся за сваё раўнапраўе. Пачатковыя вынікі іх барацьбы былі падведзены на наступны год, калі ўпершыню віншавалі лепшую палову чалавецтва.

Сёлета своеасаблівы, хаця і не зусім круглы, юбілей. Дзень жанчын адзначаецца на планеце Зямля ў 85-ы раз.

Міжволі хочацца азірнуцца назад. Чытаем радкі са сваёй газеты, датаванай 3 сакавіка 1984 г.: "У нашай краіне свята 8 Сакавіка стала сімвалам глыбокай павагі да яе раўнапраўнага становішча ў сацыялістычным грамадстве..."

Цяпер, зыходзячы з сацыяльнага і ўвогуле жыццёвага становішча, многіх нашых маці, жонак, сясцёр, дачок пра іх дабрабыт і будучыню проста не хочацца нагадваць і прагназіраваць.

І як бы там не было, не страціце веру на добрыя перамены. Упэўненасць у саміх сябе, свае магчымасці, пастаянны аптымізм -- найлепшыя лекі ад усялякіх нягод.

Дык са святам, нашы дарагія, любыя, чароўныя! Няхай спадарожнічае Вам поспех усюды і заўсёды. Моцнага Вам здароўя на доўгія гады, жаноцкага задавальнення, мацярынскага шчасця, сямейнай згоды і дабрабыту!

## НА САВЕЦЕ УНІВЕРСІТЭТА

У апошні дзень мінулага месяца адбылося чарговае пасяджэнне Савета універсітэта.

З паведамленнем аб асноўных выніках паездкі дэлегацыі ГДУ у Германію, якая адбылася ў другой палове лютага, выступіў рэктар акадэмік Беларускай акадэміі адукацыі, член-карэспандэнт АН Беларусі Л.А.Шамяткоў.

Савет заслухаў і абмеркаваў справаздачу прарэктара па АГД У.М.Палевікова аб рабоце па забеспячэнню навучальнага працэсу.

Зацверджаны тэмы кандыдацкіх дысертацый і імянныя стыпендыяты.

На конкурснай аснове на вакантныя пасады абраны: загадчыка кафедры англійскай мовы -- дацэнт Л.С.Баннікава; дацэнтамі: У.С.Гладышаў -- па кафедры гісторыі Беларусі, В.П.Зялёны -- па кафедры оптыкі, М.П.Казакоў -- па кафедры фізічнай метралогіі, В.М.Капшай -- па кафедры тэарэтычнай фізікі, І.В..Семчанка -- па кафедры агульнай фізікі, В.І.Талкачоў -- па кафедры заалогіі і аховы прыроды, У.Д.Еўтухоў -- па кафедры беларускай мовы, В.Г.Жогла -- па кафедры гідралогіі і інжынернай геалогіі. Кандыдат педагагічных навук С.С.Квяцінскі абраны на новы тэрмін старшым выкладчыкам кафедры фізвыхавання.

Савет універсітэта рэкамендаваў Атэстацыйнай калегіі Мінадукацыі і навукі Рэспублікі Беларусь на прысваенне вучонага звання дацэнт А.А.Цітовічу з кафедры эканомікі і сацыялогіі працы і С.М.Калацэй з кафедры французскай мовы.

## ІМЯННЫЯ СТЫПЕНДЫЯТЫ

По выніках зімовай сесіі 1995-96 навучальнага года рашэннем Савета універсітэта ад 29 лютага г.г. назначаны імянныя стыпендыі на другі семестр 1995-1996 навучальнага года

*Імя Ф.Скарыны:*

**КРЭШЧЫК** Людміле Уладзіміраўне -- студэнтцы V курса гісторыка-юрыдычнага факультэта.

**КУРАШОВАЙ** Таццяне Міхайлаўне -- студэнтцы IV курса эканамічнага факультэта.

**КАБЯЛКА** Вользе Фёдараўне -- студэнтцы IV курса факультэта фізічнай культуры.

*імя Я.Купалы:*

**КСЯНДЗОВАЙ** Алене Уладзіміраўне -- студэнтцы III курса беларускага аддзялення філалагічнага факультэта.

*імя акад. О.Ю.Шмідта:*

**ГАПАНОВІЧУ** Мікалаю Уладзіміравічу,

**КАЗЛОВУ** Уладзіславу Валер'евічу -- студэнтам V курса.

**ШПЫРКО** Вользе Аляксееўне -- студэнтцы III курса (усе -- матэматычны факультэт).

*імя акад. Ф.І.Фёдарава:*

**СУШКОВУ** Сяргею Уладзіміравічу,

**ШАБЛОЎСКАМУ** Яраславу Алегавічу -- студэнтам V курса фізічнага факультэта.



Поспех не прыходзіць сам па сабе. Ён выбірае людзей мэтанакіраваных, працалюбівых, адказных. І такія якасці ў Марыны Крэгер, пяцікурсніцы біялагічнага факультэта, ёсць. Дзяўчына яшча са школьных гадоў зразумела, што выдатныя веды могуць адкрыць шлях у цікавы свет спасціжэння жыцця. Атрыманне звання Сорасаўскай стыпендыяткі -- таму пацвярджэнне.

**Фота У.ЧЫСЦІКА.**

## ВІНШУЕМ!

*Рэктарат, грамадскія арганізацыі універсітэта, калектыў кафедры эканамічных тэорый горача віншуюць кандыдата эканамічных навук* **САРВІРАВА** *Барыса Уладзіміравіча з прысваеннем яму Атэстацыйнай калегіяй Мінадукацыі і навукі Рэспублікі Беларусь вучонага звання дацэнт.*

◆◆◆

*Калектыў кафедры радыёфізікі віншуе яе загадчыка доктара тэхнічных навук Юрыя Сяргеевіча* **УШАКОВА,** *які за навуковы ўклад у галіну вялікіх інфармацыйных сістэм абраны акадэмікам Міжнароднай акадэміі інфарматызацыі. Гэтая акадэмія з'яўляецца асацыіраваным членам Арганізацыі Аб'яднаных Нацый.*

*Раіць Дэйл Карнегі*

# ВЫ ЎСЕ -- ХАТНІЯ ГАСПАДЫНІ

Складайце план на наступны дзень перад тым, як ісці спаць. Многія жанчыны адчуваюць сябе загнанымі і змучанымі з-за бясконцага кола хатніх спраў і абавязкаў. Яны ніколі не могуць закончыць хатнюю работу. Ім заўсёды не хапае часу. (Кожная жанчына павінна знаходзіць час на працягу дня, каб заняцца сваёй знешнасцю. Мне асабіста здаецца, калі жанчына ведае, што яна выглядае прыгожай, яна перастае нервавацца).

І, нарэшце, пазбягайце напружання і стомленасці. Расслабляйцеся! Расслабляйцеся! Нішто так не старыць заўчасна, як напружанне і стомленасць. Нішто так не разбурае вашу маладосць і прыгажосць, як стомленасць!

Вось некалькі практыкаванняў, якія вы можаце выконваць дома. Паспрабуйце рабіць іх хаця б на працягу тыдня, і вы ўбачыце, як палепшацца ваша самаадчуванне і ваша знешнасць!

Кладзіцеся на падлогу, як толькі адчуеце стомленасць. Як ні дзіўна, цвёрдая падлога больш за ўсё падыходзіць для расслабляючых практыкаванняў, чым ложак. Падлога аказвае вялікае супраціўленне. Гэта карысна для пазваночніка. Расцягніцеся з усяе сілы, перакатвайцеся з боку на бок, калі вам хочацца. Рабіце гэта два разы на дзень.

Заплюшчыце вочы. Гаварыце штонебудзь накшталт такога: "У небе ярка свеціць сонца. Нада мной сіняе зіхатлівае неба. Прырода спакойная, і яна правіць светам. А я, як дзіця прыроды, знаходжуся ў гармоніі з Сусветам."

А можа ў вас няма магчымасці легчы? Што ж, амаль той жа самы эфект можа быць дасягнуты, калі вы сядзеце на цвёрды стул з прамой спінкай. Сядзьце прама, як сядзячая егіпецкая статуя, а рукі пакладзіце далонямі ўніз на верхнюю частку бёдраў.

Цяпер павольна напружвайце пальцы ног -- а потым расслабце іх. Напружце мышцы ног -- а потым расслабце іх. Рабіце гэта, павольна рухаючыся ўверх, з усімі мышцамі цела, пакуль не дойдзеце да шыі. Затым павольна выканайце вярчальныя рухі галавой, нібыта яна футбольны мяч.

Супакойце нервы павольным роўным дыханнем. Дыхайце глыбока. Індыйскія ёгі мелі рацыю: рытмічнае дыханне -- адзін з лепшых метадаў для супакаення нерваў.

Падумайце аб маршчынах і складках на сваім твары і разгладзьце іх усе. Распусціце складкі паміж брывамі, якія ўзнікаюць, калі вы хмурыцеся, а таксама складкі каля вуглоў роту. Рабіце гэта два разы на дзень, і, магчыма, вам не давядзецца звяртацца ў салон прыгажосці для правядзення масажу. Магчыма, паляпшэнне вашага душэйнага стану палепшыць і вашу знешнасць.

*Гэта цікава*

# ПЯРСЦЁНКІ НА РУЦЭ

Несумненна, на жаночай руцэ пярсцёнкі розных відаў сустракаюцца значна часцей, чым на мужчынскай. Са старажытных часоў яны маюць сакральнае значэнне: ахоўваюць уладальніцу, умацоўваюць яе здароўе і розум, заклікаюць удачу. Для гэтага часцей за ўсё выкарыстоўваюцца пярсцёнкі з каштоўнымі і паўкаштоўнымі каменнямі, якія валодаюць па традыцыі такімі ўласцівасцямі і з"яўляюцца спрыяльнымі па дадзеных гараскопа (гл. кнігу Э.Гонікман). Камень можна замяніць сімвалам удачы (падкоўкай), мудрасці (пярсцёнак-змейка) або яшчэ чымсьці па жаданню жанчыны. Пярсцёнкі часта выкарыстоўваюцца пры гаданні і варажбе, гэта важны элемент, напрыклад, любоўнай магіі. Адзін з сучасных варыянтаў такога роду выглядае прыкладна так: на стале выкладваюць фатаграфіі або спіс імёнаў, да пярсцёнка, падобнага на заручальны, прывязваюць нітку і, трымаючы яе кончыкамі пальцаў або ў зубах, трымаюць пярсцёнак над цікавячым імем або здымкам. Праз некалькі секунд пярсцёнак пачынае калыхацца на нітцы. Калі злева направа -- вынік адмоўны, калі назад-наперад -- станоўчы (так, як рухамі галавы мы выказваем адмаўленне або згоду), значыць гэта і ёсць самы перспектыўны аб"ект вашага інтарэсу.

Пярсцёнак быў і застаецца папулярным жаночым упрыгожваннем. Гэта важная частка гарнітура мае сваю спецыфіку: так, калі на руцэ пярсцёнак з азначаным каменем, то з такім жа каменем можа быць або толькі брошка, або завушніцы, або каралі, або кулон -- большая колькасць прадметаў з аднолькавымі каменнямі выдае дрэнны густ. Заручальны пярсцёнак, які носіцца на безыменным або сярэднім пальцы правай рукі (у пратэстантаў і католікаў -- левай), -- сімвал супружаскай вернасці. Нездарма паігрыванне заручальным пярсцёнкам лічыцца прыкметай лёгкадумнасці. Дзяўчаты часта носяць заручальны пярсцёнак на супрацьлеглай руцэ, падкрэсліваючы гэтым не толькі сваю свабоду, але і згоду ў будучым з ёй расстацца. Удовы ж па традыцыі на той жа руцэ носяць два пярсцёнкі -- свой і памёрлага мужа. Пярсцёнак можа быць памятным знакам або сімвалам прыналежнасці да азначанага роду, паказчыкам сацыяльнага статуса або заможнасці. Як і ў мужчынскім пярсцёнку, тут можа быць сакрэтнае аддзяленне, замест камня (або ў сакрэтцы пад камнем) іншы раз змяшчаюць чыйсці партрэт або, як зараз час ад часу бывае, іконку. Апошняе яўна запазычана з грэчаскай і рымскай язычаскай традыцыі.

Пярсцёнак можа мець і прыкладное назначэнне, з"яўляючыся пры гэтым упрыгожаннем. Напрыклад, калі гэта пярсцёнак-гадзіннік. Адзін з першых узораў такога роду належыў у пачатку 18 ст. жонцы англійскага караля Якава І Сцюарта. Гадзіннік меў толькі гадзінную стрэлку (мінутнай тады не было наогул) і адбіваў час, стукаючы маленькім малаточкам па пальцу праз адтуліну ў задняй сценцы. Адзіны варыянт толькі ўтылітарнага назначэння пярсцёнкаў вядомы па матэрыялах Краіны ўзыходзячага сонца -- японкі яшчэ ў мінулым стагоддзі выкарыстоўвалі вастразатачаныя краі плоскіх металічных пярсцёнкаў у якасці маленькай брытвы.

Так вось выглядае пры больш уважлівым разглядзе папулярны прадмет абіходу -- пярсцёнак.

Зразумела, жанчыны маглі б нямала дадаць да вышэйсказанага, зыходзячы з уласнага вопыту і ўражанняў.

**Я.БРОЎКІН, ст. выкладчык кафедры ўсеагульнай гісторыі.**



# АХ, ГЭТЫЯ ЖАНЧЫНЫ !..



*Меркаванні сусветна вядомых пісьменнікаў розных эпох аб жанчынах даволі супярэчлівыя. Аднак у жартоўных інтанацыях гэтых меркаванняў ёсць доля ісціны, якая дапамагае лепш спазнаць загадкавы свет жаночай прыроды.*

Бог стварыў жанчыну для таго, каб яны пакаралі мужчын.

**Вальтэр.**

Жанчына ніколі не заўважае таго, што для яе робяць, але яна заўсёды заўважыць, што для яе не зрабілі.

**Ж.Куртэлін.**

Найцяжэйшая задача ў жыцці дзяўчыны — пераканаць закаханага ў яе юнака, што яго намеры сур'ёзныя.

**Г.Роуланд.**

Трэцяя частка жанчын жадае цахудзець, другая — папраўіцца, а астатнія яшчэ не ўзважваліся.

**П.Вебер.**

Калі жанчына дае ключ ад свайго сэрца, рэдка бывае, каб яна не змяніла замок.

**Сент-Бёў.**

Жанчына павінна зрабіць выбар: з мужчынам, які падабаецца жанчынам, яна ніколі не будзе спакойнай, а з мужчынам, які не падабаецца жанчынам, не будзе шчаслівай.

**Анатоль Франс.**

## КУР'ЁЗЫ І АНЕКДОТЫ

Жанчыны заўсёды умеюць зрабіць з нічога салат, капялюшык і сямейны скандал.

* * *

Адна маладая асоба прачытала ў газеце аб'яву мужчыны, які жадаў набыць спадарожніцу жыцця. Дзяўчына паслала яму пісьмо: «Я з задавальненнем сустрэнуся з вамі ў бліжэйшую нядзелю ў 2 гадзіны дня. Каб я магла вас пазнаць, вы павінны трымаць на правай руцэ норкавае футра 46-га размеру».

* * *

Жонка кажа мужу:

— Я збегаю да суседкі на хвілінку, а ты памешвай кашу кожныя паўгадзіны.

* * *

— Чаму на вуліцы мужчына павінен ісці злева ад жанчыны?

— Таму што ў правай руцэ ў яе гаспадарчая сумка.

* * *

У тры гадзіны ночы міліцыянер спыняе прахожага:

— Куды вы накіроўваецеся?

— На лекцыю аб маралі.

— Не дурыце мне галавы! Хто чытае лекцыі на такія тэмы ў такі час?

— Мая жонка...

* * *

Жанчына павінна выкарыстоўваць для сваёй абароны любы прадмет, які акажацца ў яе сумачцы. Гэта можа быць расчоска, дэзадарант, але лепш за ўсё кавалак вадаправоднай трубы.

* * *

— Ёсць шмат дзяўчат, якія не хочуць выходзіць замуж.

— Адкуль ты ведаеш?

— Я ім прапаноўваў.

* * *

У абутковым магазіне муж і жонка выбіраюць туфлі.

— Паглядзі, — кажа жонка, — якія сімпатычныя лакіраваныя туфелькі!

— Ты паглядзі лепш на цану, — адказвае муж. — За такія грошы кацер можна купіць.

* * *

Хлопчык убачыў у кіно, як індзейцы расфарбоўвалі сабе твары, і спытаў у бацькі, навошта яны гэта робяць.

— Рыхтуюцца да вайны.

Вечарам хлопчык убягае да бацькі:

— Тата, уцякаем, мама да вайны рыхтуецца!

* * *

— Прабачце, што грошы мокрыя! — сказала дама прадаўцу ў магазіне футравых вырабаў. — Муж так рыдаў, так рыдаў, калі даваў іх мне.

* * *

Сусед суседу:

— Вы ведаеце, што такое шампанскае па-дамашняму?



— Не.

— Гэта калі муж п'е гарэлку, а жонка шыпіць.

* * *

Муж жонцы:

— Дарагая, ты хацела на дзень нараджэння норку. Я табе купіў, толькі карміць яе сама будзеш.

* * *

Малады чалавек ніяк не асмельваўся зрабіць прапанову дзяўчыне. У рэшце ён адважыўся зрабіць гэта па тэлефоне.

— Гэта ты, Вера?

— Так, я.

— Выходзь за мяне замуж! Ты згодна?

— Згодна! А хто гэта гаворыць?

* * *

Мая жонка недзе чытала, што карысна есці ўсё сырое.

— Мая таксама не любіць рыхтаваць ежу.

* * *

Жанчына скардзіцца сваёй сяброўцы:

— Мой муж ніколі не кладзе рэчы на месца. Уяві сабе, учора я цэлую гадзіну шукала яго бумажнік!

* * *

Рэпарцёр пытае ў кіназоркі:

— Дзе вы пазнаёміліся са сваім шостым мужам?

— На паляванні. Калі ён застрэліў майго пятага мужа.

* * *

— Купіце кветкі! Купіце кветкі для жонкі.

— Я не жанаты.

— Тады для каханай.

— Няма ў мяне ніякай каханай.

— Купіце тады ў гонар таго, што ў вас такое бесклапотнае жыццё.

* * *

Две дамы размаўляюць пра замужжа:

— Мне здаецца, -- кажа адна, — што замужжа нагадвае міраж у пустыні: з палацам, пальмамі і вярблюдам. Спачатку знікае палац, потым пальмы, і застаешся з адным вярблюдам.

СПОРТ

## НАШАМУ СТУДЭНТУ АПЛАДЫРАВАЛІ Ў НАРВЕГІІ

У нарвежскім горадзе Посгруне прайшоў буйны міжнародны турнір з серыі Гран-пры па грэка-рымскай барацьбе, які сабраў майстроў дывана з США, Венгрыі, Германіі, Польшчы, Расіі, Японіі, Беларусі і скандынаўскіх краін.

Беларускія волаты заваявалі пяць вышэйшых узнагарод, што забяспечыла ім агульнакамандную перамогу.

На прэстыжным турніры студэнт факультэта фізічнай культуры ГДУ Вячаслаў Макаранка (82 кг) удастоены таксама залатой узнагароды.

## СТАЎ ЧЭМПІЁНАМ РАСІІ

У Маскве завяршыўся зімовы адкрыты чэмпіянат Расіі па лёгкай атлетыцы.

Студэнт факультэта фізічнай культуры Аляксандр Слюнькоў стаў не толькі чэмпіёнам Расіі ў бегу на 200м -- 21,3 сек., але і ўпершыню выканаў нарматыў майстра спорту міжнароднага класса.

Нашага здольнага спартсмена трэніруе дацэнт кафедры лёгкай атлетыкі і лыжнага спорту Ю.П.Працко.

## АСНОЎНАЯ БАРАЦЬБА -- НАПЕРАДЗЕ

У Гомельскім Палацы лёгкай атлетыкі праведзены чацвёрты тур чэмпіянату Беларусі па гандболу сярод жаночых каманд.

Наша каманда "Універсітэт" перамагла "Аркатрон" -- 31:25 і спартсменак Акадэміі фізічнай культуры і спорту -- 20:19. Але выступаючы ў аслабленым саставе, яна ўступіла мінскім "Політэхніку-1" -- 20:32 і "Політэхніку-2" -- 21:28.

У лідэра чэмпіянату "Політэхніка-1" -- 28 ачкоў. Другое месца ў турнірнай табліцы займае наш "Універсітэт" -- 22 ачкі, на трэцім месцы з 19 ачкамі "Політэхнік-2".

Як адзначыў трэнер Валерый Крукоўскі, з-за траўм у дамашнім туры не выступала пяць асноўных ігракоў. Лепшымі ж на ім былі гамяльчанкі варатар Наталля Гарунова і бамбардзір Анжэліка Кукбая.

У пятым туры, які пачнецца ў Мінску 13 сакавіка, за выхад у першую чацвёрку павядуць барацьбу ўжо шэсць каманд з васьмі, якія стартавалі ў чэмпіянаце.

**В.МАРЧАНКА.**

На медыцынскія тэмы

## ГЭТА НЕЛЬГА ІГНАРАВАЦЬ

Апошнім часам медыкі занепакоены ростам колькасці хворых на туберкулёз -- складаную інфекцыйную і сацыяльную хваробу. Адзіным метадам своечасовага яе выяўлення яшчэ на ранніх стадыях з"яўляецца рэнтгена-флюраграфічнае абследаванне. Згодна загада N 143 ад 1992 г. Рэспублікі Беларусь усё насельніцтва, пачынаючы з 17-гадовага ўзросту, павінна абавязкова штогадова абследавацца, каб папярэдзіць гэту хваробу.

Студэнтам нашага універсітэта таксама неабходна праходзіць флюраграфічнае абследаванне. Аднак, на жаль, многія з іх гэта ігнаруюць. Па дадзеных медпункта ГДУ 606 студэнтаў I-IV курсаў на працягу больш двух гадоў гэтага не рабілі. Дэканатам факультэтаў неабходна ўзяць пад кантроль праходжанне студэнтамі флюраграфічнага абследавання і прызначыць адказных асоб па выкананню імі належнай працэдуры.

Усім студэнтам, хто не прайшоў абследаванне, неабходна з"явіцца ў медпункт ГДУ за накіраваннем на яго.

Памятайце! Стан вашага здароўя залежыць ад вашых адносін да яго.

**Н.МАРЧАНКА, загадчыца медпункта ГДУ.**

Сумныя нататкі з нагоды свята

## ЦІ СУДЖАНА ЗБЫЦЦА МАРЫ?..

Нас, жанчын, называюць слабым полам. Як хочацца, каб так было на самой справе ў сённяшнім нашым жыцці! Мы ж павінны адчуваць у сабе сілу і моц, калі раніцай і ўвечары "штурмуем" тралейбус, калі цягнем дадому важкія сумкі і пакеты з прадуктамі для сям"і, ці нясем кулінарную вахту каля пліты...

А так хочацца адчуць сябе па-сапраўднаму слабымі пад апекай нашых мужчын. Каб заставалася больш часу і для сябе, і сваіх родных, блізкіх, каханых.

Ці суджана ажыццявіцца жаночай мары?..

**Т.НІКАЛАЕВА.**

## СПЯШАЙЦЕСЯ Ў ЦЫРК!

Зрабіце прадстаячыя святочныя дні па-сапраўднаму радаснымі і прыемнымі для сябе і сваіх дзяцей. Паглядзіце ў Гомельскім цырку цікавую праграму "Цыркавы сувенір". Вы апынецеся ў свеце фантазіі і чарадзейства. На манежы выступаюць вядомыя майстры цырка з арыгінальнымі атракцыёнамі -- "Экзатычныя жывёлы" (дрэсіраваныя поні, зебры, малпы, страусы, удавы,ослікі); спартыўна-танцавальнае шоу мядзведзяў; "Гульні народаў Поўначы" (паўночныя алені і сібірскія лайкі); "Ікарыйскія гульні", "Ілюзія" і інш. Паветраныя гімнасты, сілавыя жанглёры здзівяць вас сваёй грацыёзнасцю, спрытам і смеласцю. Не ўстрымаецеся вы ад шчырай усмешкі і пасля выступленняў забаўных клоунаў.

**ГОМЕЛЬСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ УНІВЕРСІТЭТ імя Ф.СКАРЫНЫ**

аб"яўляе конкурс на замяшчэнне вакантных пасад па кафедрах:

-- тэорыі і методыкі фізічнай культуры -- выкладчыка;

-- фізвыхавання -- выкладчыка;

-- правазнаўства -- асістэнта.

Тэрмін падачы заяў -- не пазней 1 месяца з дня апублікавання. Заявы накіроўваць на адрас: 246699 г.Гомель, вул. Савецкая, 104.

**РЭКТАРАТ.**

Аўтары надрукаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць прыведзеных фактаў, цытат, эканамічных даных, асабістых імён, геаграфічных назваў і іншай інфармацыі, а таксама за тое, каб у матэрыялах не ўтрымлівалася даных, якія не падлягаюць адкрытый публікацыі. Рэдакцыя можа друкаваць артыкулы ў парадку абмеркавання, не раздзяляючы пункту гледжання аўтара.

ЗАСНАВАЛЬНІК -- Гомельскі дзяржаўны універсітэт імя Ф.Скарыны.

Наш адрас: 246699, г. Гомель, вул. Савецкая, 104, пакой 1-18, тэл. 57-43-21.
Рэгістрацыйны № 221
Спонсары газеты -- НВП "Сучасныя тэхналогіі", прафком студэнтаў.

Газета набрана і зверстана на настольна-выдавецкім комплексе ІВЦ ГДУ.

Рэдактар
Ул.П. БАЛОГА

Аб'ём 1 друк. арк.
Тыраж 1.000 экз.
Заказ
Падпісана да друку 01.03.96.